


**Вы даведаецеся:** Разнастайнасць свету жывёл, якія насяляюць лясы, вадаёмы, адкрытыя тэрыторыі (лугі, палі), жывуць побач з чалавекам у яго жыллі або ў непасрэднай блізкасці ад яго. Уплыў гаспадарчай дзейнасці чалавека на відавую разнастайнасць жывёл. Ахова відаў, якія знаходзяцца на мяжы знікнення.

Падчас эвалюцыі жывёлы прыстасаваліся да розных умоў пражывання, спосабу здабывання корму, абароны ад ворагаў і адрозніваюцца відавой разнастайнасцю. Вялікі ўплыў на жывёльны свет робіць гаспадарчая дзейнасць чалавека. Дзяржава ахоўвае віды, якія знаходзяцца на мяжы знікнення, уключае іх у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

## § 59. Экалагічныя групы жывёл

**Успомніце:** **1.** На якія групы падзяляюцца птушкі ў залежнасці ад месца пражывання? **2.** Якія жывёлы насяляюць лес, вадаёмы і адкрытыя прасторы? **3.** Якія жывёлы называюцца сінантропнымі?

Жывёльны свет Беларусі характарызуецца багатай разнастайнасцю. Больш за 500 відаў пазваночных і каля 30 тыс. відаў беспазваночных жывёл насяляюць розныя экасістэмы Беларусі.

Па характары месцаў пражывання жывёл можна аб’яднаць у экалагічныя групы: жывёлы лясоў, жывёлы вадаёмаў, жывёлы адкрытых тэрыторый, сінантропныя жывёлы.

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

**Жывёлы лясоў.** Лясная экасістэма характарызуецца вялікай відавой разнастайнасцю раслін, якія з'яўляюцца для жывёл кормам, жыллём або хованкай. Жывёлы насяляюць усе ярусы лесу: дрэвы, кусты, кусцікі, травы.

У каронах дрэў жывуць насякомыя, якія кормяцца лісцем і ігліцай (*жукі-даўганосікі*, *жукі-лістаеды*, вусені матылёў). Многія насякомыя шкодзяць ствалам *(жукі-караеды)* і караням (лічынкі хрушчоў) дрэў. Вялікая колькасць насякомых прываблівае ў лясную экасістэму насякомаедных птушак *(сініц, дзятлаў, зязюль, драздоў)*. Асноўную частку жыцця на дрэвах праводзяць і некаторыя млекакормячыя *(вавёркі, куніцы)*.

Сярод высокай расліннасці знаходзяць прытулак буйныя млекакормячыя *(ласі, алені, дзікі)*. У падлеску і траве хаваюцца дробныя жывёлы *(зайцы, вожыкі)*. У глебе жывуць насякомаедныя *(краты, буразубкі)* і грызуны *(мышы)*. Раслінаеднымі птушкамі і млекакормячымі кормяцца драпежныя звяры *(ваўкі, рысі, лісіцы)* і птушкі *(совы, пугачы)*.

Вялікая раслінная біямаса лесу стварае спрыяльныя ўмовы для беспазваночных жывёл. Перапрацоўваюць арганіку, якая гніе, і спрыяюць глебаўтварэнню некаторыя *круглыя* (глебавыя) і *кольчатыя (дажджавыя) чэрві*, а таксама лічынкі насякомых.

Вялікую ролю выконваюць жывёлы, якія кормяцца насеннем і пладамі раслін (зерняедныя птушкі, грызуны). Яны забяспечваюць распаўсюджванне раслін на вялікія адлегласці.

**Жывёлы вадаёмаў.** Прыродныя і штучныя вадаёмы нашай краіны з'яўляюцца асяроддзем пражывання для мноства жывых арганізмаў. Некаторыя з іх пастаянна знаходзяцца ў вадзе, іншыя праводзяць там значную частку жыцця, але пры гэтым не страчваюць сувязі з сушай.

У тоўшчы вады жывуць дробныя ракападобныя *(дафніі, цыклопы)*, імі кормяцца рыбы *(карасі, акуні)*. У сваю чаргу дробная рыба з'яўляецца здабычай драпежнікаў *(шчупакоў)*. Некаторыя рыбы *(лінь, лешч)* палююць на донных беспазваночных (лічынак насякомых, чарвей, малюскаў). У глыбакаводных рэках і азёрах водзіцца самая вялікая рыба нашых вадаёмаў — *сом*.

Прыбярэжную зону вадаёмаў насяляюць жыгучыя *(гідры)*, плоскія чэрві *(планарыі)*, малашчацінкавыя чэрві *(трубачнікі)*, малюскі *(бяззубкі, балацянікі)*, ракападобныя *(рачны рак)*, павукападобныя *(павук-серабранка)* і насякомыя (*жук-плывунец*, лічынкі стракоз).

Каляводнае асяроддзе пражывання засвоілі многія пазваночныя жывёлы. Сярод іх — земнаводныя *(жабы)*, паўзуны *(вужы)*, птушкі

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

*(качкі, чайкі, лебедзі)*, млекакормячыя *(бабры)*. Некаторыя віды гусей, кулікоў і качак спыняюцца на вадаёмах нашай краіны толькі ў перыяд сезонных пералётаў.

**Жывёлы адкрытых тэрыторый.** У Беларусі адкрытымі тэрыторыямі лічацца палі і лугі. Іх травяністая раслiннасць з'яўляецца кормам і сховішчам для дробных жывёл.

Жывёльны свет лугавой і палявой экасістэм прадстаўлены беспазваночнымі і пазваночнымі. Сярод іх пераважаюць разнастайныя насякомыя (*матылькі*, *пчолы*, *жукі*, *мухі*, *камары* і інш.), імі кормяцца земнаводныя *(жабы, рапухі)*. На земнаводных палююць паўзуны *(вужы)*.

Тыповымі прадстаўнікамі адкрытых тэрыторый з'яўляюцца грызуны (*мышы, палёўкі)*.

На лугах і палях кормяцца многія птушкі, там яны будуюць гнёзды, гадуюць птушанят *(курапаткі, жаўрукі)*. У пошуках спажывы на адкрытыя прасторы выходзяць млекакормячыя *(вожыкі, зайцы, лісіцы)*.

**Сінантропныя жывёлы.** Існуюць жывёлы, якія прыстасаваліся жыць побач з чалавекам. Адных прыцягвае лёгкасць здабычы, другіх — наяўнасць у паселішчах чалавека хованак ад неспрыяльных прыродных умоў і драпежнікаў, трэціх — прыдатны мікраклімат у жылых памяшканнях.

Практычна нельга заўважыць па-за населенымі пунктамі *голуба шызага*, *вераб'я дамавога*, *прусака*, *клапа пасцельнага*. Шпакі, галкі, вароны, ластаўкі сустракаюцца ў дзікай прыродзе, але аддаюць перавагу месцам пражывання чалавека.

Сінантропныя жывёлы прыносяць як карысць (насякомаедныя птушкі), так і шкоду *(пацукі, мышы)*. Першых чалавек прываблівае (напрыклад, падкормлівае птушак у зімовы час), а з другімі пастаянна змагаецца (напрыклад, расстаўляе пасткі).

**Паўторым галоўнае.** Кожная экасістэма характарызуецца пэўным відавым складам жывёл, паколькі яны прыстасаваліся да розных умоў пражывання. Жывёлы насяляюць усе ярусы лесу: дрэвы, кусты, кусцікі, травы. Мноства беспазваночных і пазваночных жыве ў вадзе і каля яе, а таксама на адкрытых прасторах. Сінантропныя жывёлы прыстасаваліся да існавання побач з чалавекам.

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

**Пытанні і заданні.** **1.** На якія групы падзяляюцца жывёлы ў залежнасці ад іх месцаў пражывання? **2.** Прывядзіце прыклады жывёл лесу. **3.** Якія жывёлы з'яўляюцца насельнікамі вадаёмаў? **4.** Назавіце жывёл, якіх можна сустрэць у полі ці на лузе. **5.** Чаму жывёлы селяцца побач з жыллём чалавека? Прывядзіце прыклады такіх жывёл.

## § 60. Узаемаадносіны чалавека і жывёл. Ахова жывёл

**Успомніце:** Якое значэнне маюць жывёлы ў жыцці чалавека?

**Змена колькасці жывёл пад уплывам дзейнасці чалавека.** Гаспадарчая дзейнасць чалавека можа прывесці да зніжэння колькасці і нават знікнення некаторых відаў жывёл. Гэта асушэнне зямель, нерацыянальнае выкарыстанне мінеральных угнаенняў, забруджванне паветра адходамі, пашырэнне транспартнай сеткі аўтамабільных дарог і чыгункі, высечка лясоў, браканьерства.

Гаспадарчая дзейнасць чалавека прывяла за апошнія стагоддзі да таго, што на тэрыторыі нашай краіны перасталі існаваць больш за 20 відаў пазваночных жывёл: *тур* (першабытны бык), *расамаха*, *бялуга* і інш. На мяжы поўнага знікнення знаходзіліся *зубр еўрапейскі*, *алень высакародны*, *бабёр рачны*, *мядзведзь буры* і інш.

Скарачэнне відавой разнастайнасці жывёл змушае людзей шукаць шляхі вырашэння гэтай праблемы. У Рэспубліцы Беларусь на заканадаўчым узроўні вызначаны тэрміны і маштабы нарыхтоўкі рыбы, дзічыны, пушніны, выкарыстання жывёл у навуковых, культурна-асветных і эстэтычных мэтах.

**Рассяленне жывёл і аднаўленне колькасці відаў, якія знаходзяцца на мяжы знікнення.** Шляхам рассялення (з'яўленне жывёл за межамі вобласці іх распаўсюджвання, якое ажыццяўляецца без прамога ўдзелу чалавека) адноўлена колькасць *бабра рачнога*, *лася*. Знаходзіцца на стадыі аднаўлення колькасць *зубра еўрапейскага* і *аленя высакароднага*.

Дзякуючы акліматызацыі (рассяленне жывёл за межы іх арэала, якое ажыццяўляецца з прамым удзелам чалавека) вадаёмы нашай краіны папоўнілі больш за 10 відаў каштоўных рыб: *стронга вясёлкавая*, *таўсталобік белы*, *таўсталобік стракаты*, *карась сярэбраны*, *амур белы* і інш.

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»